*Аляксандр Смолік*

## МАТЫЎ ЗАКЛЯТАГА СКАРБУ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

У шматвекавой гісторыі беларускай літаратуры фальклорныя традыцыі займаюць асаблівае месца. Бо на працягу многіх стагоддзяў вусная народная творчасць з'яўлялася адзіным носьбітам і выразнікам ідэйна-мастацкага вопыту шырокіх народны мас. У тагачасных умовах у Беларусі сапраўды склалася ўнікальная сітуацыя, калі фальклор вымушана пераўтварыўся ў адзіны сродак эстэтычнага адлюстравання рэчаіснасці, стаў адначасова летапісам і філасофіяй народа, яго духоўна-прыкладной энцыклапедыяй. Гэта ўніверсальнасць сацыяльна-эканамічных і мастацкіх функцый фальклору не магла не адбіцца на зараджэнні і фарміраванні новай беларускай літаратуры.

Зварот да вуснай народнай творчасці як да першаасновы ў момант фарміраваня літаратурнай традыцыі быў цалкам заканамернай з'явай, апраўданай гісторыяй і тагачасным светапоглядам. На самым пачатковым этапе фальклор уплываў на літаратуру як адна з важнейшых стыхій нацыянальнага жыцця, адкуль прафесійная літаратура наследавала ген нацыянальнай самабытнасці і са свайго боку пускала карані ў нацыянальную глебу. Цікавасць да вусна-паэтычнай спадчыны з боку пачынальнікаў беларускай літаратуры была абумоўлена не толькі відавочным уплывам еўрапейскага рамантызму з яго імкненнем знайсці ідэал у містычным і фантастычным, але і з адкрыццём забытага гісторыяй шматмільённага народа з яго самабытнай культурай і перакананнем у вялікія магчымасці яго мовы і духоўнай творчасці.

Сярод плеяды пачынальнікаў айчыннага прыгожага пісьменства XIX ст., бадай што самым аўтэнтычным з'яўляецца Ян Баршчэўскі. Літаратурная творчасць пісьменніка прыпадае на перыяд росквіту рамантызму ў польскай літаратуры. Але, па меркаваннях літаратуразнаўцаў, польскі рамантызм узнікае на Беларусі, Літве і Украіне ў своеасаблівай форме. І своеасаблівасць яго, як творчага метаду, заключалася ў тым, што развіваўся ён, улічваючы мясцовую фальклорную традыцыю і здабыткі вуснай народнай творчасці. Як пісьменнік-рамантык, Ян Баршчэўскі захапіўся менавіта тымі рысамі фальклору, якія ўяўляюць каштоўнасць для беларусаў, па-новаму апрацаваў іх, узняўшы адметныя тэмы і сюжэты, вобразы і сродкі мастацкай выразнасці характэрнай фальклорна-рамантычнай плыні. Першым сярод арыгінальных аўтарскіх твораў мы вылучаем зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» – твор адметны для беларускай літаратуры па форме і па змястоўнай напоўненасці. Урэшце ён з'яўляецца цікавым і ў фальклорным плане [1]. Творы фальклорнага паходжання падаюцца ў зборніку Яна Баршчэўскага як сукупнасць апавядальных гісторый, якія аб'яднаны ў адзіную кнігу пэўнымі кампазіцыйнымі законамі. Пісьменнік выкарыстоўвае для сваіх фантастычных сюжэтаў беларускую казку, але выкарыстоўвае творча. Казка бярэцца не жыўцом, не ўся, а скарыстоўваюцца толькі асобныя яе элементы, якія натуральна ўплятаюцца ў сюжэт апавядання пра рэальныя падзеі. Рэальнасць у Баршчэўскага лёгка пераходзіць у фантастыку і наадварот.

Адным з заўважных матываў, перанятых з вуснай народнай творчасці і па-мастацку перапрацаваных, з'яўляецца матыў заклятага скарбу, які неаднойчы сустракаецца ў творы. Упершыню з зачараваным багаццем, якое спакушае чалавека, на першы погляд, сваёй легкадаступнасцю, але тым самым зводзіць яго ў зман, сустракаецца чытач у другой апавядальнай гісторыі «Зухаватыя ўчынкі» [1, с. 43-65]. Далей апавядальнік падае легенду пра Вужыны камень, якая ўдала ўплятаецца ў канву арыгінальнага аўтарскага твора [1, с. 65-72]. Паводле энцыклапедыі «Міфалогія беларусаў», вужыныя і змеевыя камяні адна з катэгорый сакралізацыі камянёў. Легенда пра Цмока, які нёс грэшніку шмат золата і срэбра за прададзеную д'яблу душу і якога нябесныя сілы пераўтварылі ў камень, а яго скарбы самі закапаліся пад той камень, мае цалкам фальклорнае паходжанне і ўваходзіць у шэраг легенд пра акамянелых істот: скамянелага аратага, які быў пакараны разам з валамі за тое, што працаваў на Вялікдзень, акамянелыя вяселлі, якія сустрэліся і не саступалі адзін аднаму дарогу, або вяселле сустрэлася з лютым Змеем, акамянелых жывёл [1, с. 26-48]. Цмок-лятун з'яўляецца міфалагічным вобразам, характэрным для ўсяе еўрапейскае прасторы. Працяг фальклорнай традыцыі бачыцца і ў самастойным пагружэнні ў зямлю рэчаў з заклятага скарбу і іх наступнае з'яўленне ў розных фантастычных постацях: карузлікаў, што скакалі на пагорку, чорных казлоў, што скакалі з зямлі на камень і з каменя на дол (дарэчы, на вобраз казы ў беларускім фальклоры наклаліся дзве традыцыі: язычніцкая і хрысціянская, і менавіта язычніцкая была выкарыстана Янам Баршчэўскім у пададзенай легендзе: каза ёсць стварэнне чорта, жывёліна, што цесна звязана з нячыстай сілай, якую стварыў чорт, пазайздросціўшы творчаму запалу Бога, яна нават сваім знешнім выглядам засталася падобнай на чорта рагамі, барадой, шклянымі вачыма).

Унікальны і амаль што індывідуальна-аўтарскі вобраз, уведзены Янам Баршчэўскім у мастацкі свет, вобраз Плачкі, якая таксама з'яўляецца каля Вужыныга каменя са скарбамі. Яшчэ адным літаратурным прыкладам, у якім сустракаецца фальклорны матыў заклатага скарбу, з'яўляецца

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

апавяданне «Плачка» з ужо згаданага твора Я. Баршчэўскага [1, с. 125-136]. Вобраз Плачкі не характэрны для беларускай міфалагічнай традыцыі і ўяўляе сабой ні што іншае, як творчую пераапрацоўку мясцовых паданняў аб валатоўнах – жанчынах-асілках, надзеленых незвычайнай сілай. Справа ў тым, што міфалагічны вобраз Плачкі з' яўляецца пазнейшым па часе свайго ўзнікнення ў дачыненні да старажытнага вобраза жанчын-багатырак. У Я. Баршчэўскага Плачка спалучае ў сабе якасці валатоўны і вяшчунні, якая можа прадказваць нястачы і беды і захоўваць памяць пра мінулае. Пераапрацоўваючы мясцовыя паданні аб валатоўнах, Ян Баршчэўскі надзяляе Плачку функцыямі персаніфікаванай маральнасці цэлага краю, якая захоўвае памяць пра мінулае і пільнуе сучасныя норавы.

Прааналізаваўшы дазенае апавяданне, можна сказаць, што фальклорная традацыя ў ім амаль цалкам захоўваецца. Найперш патрэбна звярнуцца да прапанаваных Баршэўскім варыянтаў творчай апрацоўкі паданняў пра заклятыя скарбы, якія звязаны з непаўторным аўтарскім вобразам Плачкі. У першым згаданым у творы варыянце падання гаворыцца пра тое, як Плачка дапамагла ўбогаму сляпому жабраку, які спяваў малітву ў пустой хаце. Яна нечакана з' явілася перад ім, кінула жменю срэбных манет і імгненна знікла, ухваліўшы старога за шчырую веру і малітву. Такім чынам, спрадвечны фальклорны сюжэт пра тое, што скарб даецца сумленнаму набожнаму чалавеку сам у рукі звязваецца з уплывам боскай сілы, цалкам адлюстраваны ў дадзеным апавяданні. Асуджаючы сквапнасць да грошай, чалавечую пыху і сапсаваныя норавы людзей, аўтар уводзіць літаратурную апрацоўку яшчэ аднаго падання пра заклятыя скарбы, на месцы якіх па меркаванні маладога пакалення з' яўлялася Плачка. Апантаныя прагай лёгкага абагачэння, шэраг маладых вяскоўцаў прышлі на ўказанае прывідам месца, дзе стаяла закінутая каплічка. Але атрымалася так, што яны раскапалі магілкі. Больш таго, нічога неатрымаўшы, пэўна разззлаваўшыся на ўбогага старога, які папярэджваў аб памылковасці і марнасці іх задумы і сцвярджаў пра забытую святасць аплаканага зданню месца, людзі вырашылі пэўным чынам адпомсціць жабраку, укінуўшы яму ў акно асінае гняздо, абвязанае хусткай, якое, пасля здзяйснення дадзенага запланаванага жорсткага і бесчалавечнага ўчынка, рассыпаецца золатам. У дадзеным месцы апавядання пазнаецца казачны сюжэт пра наканаваны скарб, змешчаны ў паказальніку сюжэтаў Барага з тым толькі адрозненнем, што там гаварылася пра пана, які знайшоўшы замест скарба дохлага сабаку, са злосці ўкінуў яго ў вакно бедняку, і скарб рассыпаўся золатам. Такім чынам, прасочваецца відавочная аўтарская апрацоўка. Ян Баршчэўскі хоча сказаць, што хцівасць, сквапнасць і неапраўданая жорсткасць уласціва не толькі панам, але і простым людзям, у той час, калі народнае паданне цалкам на баку бедната. Тым не менш, вобраз пана сустракаецца ў наступным паданні дадзенага апавядання. Пану таксама з'явіліся аднойчы Плачка на руінах замка. Паверыўшы разважанням тых людзей, «якія думаюць усё жыццё пра выгоду, хочуць, каб чароўны дух спяваў ім толькі пра золата і срэбра і паказваў скарбы, схаваныя ў зямлі», пан загадаў аканому пачаць на тым месцы раскопкі. Аканом хоць і быў з засцянковае шляхты, але верыў народным перасцярогам пра нешчаслівы лёс людзей, якія імкнуцца авалодаць заклятымі скарбамі, якія пагражаюць хціўцам хваробамі. Я. Баршчэўскі ў дадзеным апавяданні згадвае таксама фальклорны элемент заклятага багацця, якое не даецца ў рукі, а апускаецца глыбей пад зямлю. Але пан абвінаваціў аканома ў залішняй забабоннасці і прымхлівасці, абазваўшы яго «савой, якая страшыць людзей жахлівымі прароцтвамі». З аднаго боку, перасцярогі аканома маюць пад сабой мудрую народную аснову, горкі вопыт людзей, што калісьці сутыкаліся з падобнымі праявамі, а з другога боку, не звяртаючы ўвагу на аканомавы забабоны, кіруючыся не толькі прагай нажывы, а ў большай ступені цікаўнасцю, пан завяршыў раскопкі, знайшоўшы старажытную катавальню з мноствам шкілетаў. Менавіта гэта месца і паказвала людзям Плачка, каб яны пахавалі па-боску нявінна закатаваных людзей і душы іхнія супакоіліся. Пан жа за настойлівасць у дадзенай справе атрымаў ва ўзнагароду старажытныя кайданы і захаваў іх у сябе як помнікі мінуўшчыны.

Трансфармаваным варыянтам народнгага падання з' яўляецца паданне пра скарб, схаваны пад дзікім каменем на пагорку, які насамрэч з'яўляецца забытай магілай героя-волата. Знайшоўшы магілу замест скарба, людзі ў роспачы ад няспраўджанай надзеі вырашаюць разрабаваць прах загінуўшага, зняць са шкілета зброю «на памяць». Дадзены сюжэт ужо вядомы ў вуснай народнай творчасці ў дачыненні да лёсу рэчаў з заклятага скарба, якія бароніць не толькі сама зямля, але і звышнатуральныя сілы ў выглядзе раз'юшанай здані ваяра. Так Плачка ў Яна Баршчэўскага ў чарговы раз падманула надзеі людзей, указаўшы ім не на залаты скарб, а на забытую святыню ў выглядзе магілы славутага продка, выпрабоўваючы тым самым чалавека на маральнасць і чалавечнасць.

На прыкладзе дадзенага апавядання можна яшчэ раз падкрэсліць агучаную ўжо выснову аб тым, што сувязь аповесці Яна Баршчэўскага з народна-фантастычнымі формамі празаічнага апавядання відавочная. Найперш гэта звязана з уплывам рамантызму на літаратурнае жыццё ў прыватнасці і на стыль жыцця самога чалавека ў цэлым. Зварот да мінуўшчыны і вуснапаэтычнай творчасці як да крыніцы натхнення і ў нейкай ступені пераймання быў уласцівы і беларускім літаратарам канца XIX ст. Фальклорныя вобразы цалкам пераасэнсоўваюцца ў адпаведнасці з рамантычнымі поглядамі аўтара «Шляхціца Завальні». Своеасаблівую трансфармацыю ў творы атрымалі і варыянты народных паданняў пра заклятыя скарбы. У асноўным аўтарскае пераасэнсаванне паданняў пра заклятыя скарбы было накіравана на марльны бок і найперш мела ў сваёй аснове дыдактычную мэту. Асуджаючы чалавека за падзенне нораваў, пераступанне праз спрадвечныя законы чалавечнасці ў сваім сляпым імкненні да лёгкіх грошай, Ян Баршчэўскі карае зухаватага хціўца Васіля за яго бязвер'е і звадкі з нечысцю,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і наадварот узнагароджвае за набожнасць і пакуты беднасці ўбогіх вяшчуноў народнай праўды, што перасцерагаюць хціўцаў, што за золата могуць прадаць і душу, і святыні продкаў.

## Спіс літаратуры:

1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі.– Мн.: Маст.літ., 1990.– 383 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУКИ